## Беларускае радыё ў Злучаных Штатах

Як ужо было зазначана, першая беларуская радыёпраграма была заснаваная ў 1928—1929 гадох у Чыкага Язэпам Варонкам. Гэтыя перадачы былі вельмі папулярныя, аднак дзеля фінансавых прычынаў яны мусілі быць пашыраныя за кошт дадатку вяшчаньня ў іншых мовах. Беларускія перадачы Я.Варонкі гучалі ў эфіры каля году; пасьля іхнага закрыцьця Я.Варонка рыхтаваў перадачы па-расейску ды ў іншых славянскіх мовах, зрэдчас устаўляючы між іх праграму па-беларуску[49].

Беларускія праграмы былі адноўленыя ў Чыкага падчас Другое сусьветнае вайны стараньнямі а. Яна Тарасэвіча, яны рэгулярна выходзілі ў эфір на працягу некалькіх гадоў[50].

З прыездам у Злучаныя Штаты ў канцы 40-х гадоў паваеннае хвалі беларускае іміграцыі беларускія праграмы з нагоды беларускіх нацыянальных сьвятаў перадаваліся ў розных гарадох — Дэтройце, Чыкага, Нью-Ёрку, Філадэлфіі, Кліўлэньдзе ды іншых[51].

Рэгулярныя беларускамоўныя праграмы ўзьнікалі й пазьней. Гэткія былі перадачы Паўла Куляша ў Дэтройце (1952—1953), Міхася Казьлякоўскага ў Трэнтане (перадачы на рэгіён Нью-Ёрк—Нью-Джэрзі, 1958—1959), Міколы Дзямідава ў Чыкага (1950), а таксама беларуская радыёпраграма «Нёман», запачаткаваная Нікодымам Жызьнеўскім у Чыкага ў 1960 годзе, якая гучыць у эфіры й дагэтуль[52].

Апошнімі гадамі беларусы ў Злучаных Штатах пачалі слухаць беларускія праграмы «Радыё Свабода», а таксама перадачы замежнага вяшчаньня Беларускага Радыё зь Менску, шырака рэклямаваныя «Голасам Радзімы»[53].